# *ВЕРШЫ, ПЕСНІ, ЭКСКУРС У ГІСТОРЫЮ*

**СМАРГОНЬ. Напярэдадні Дня абаронцаў Айчыны і Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь перад пагранічнікамі Смаргоншчыны выступіла член Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэтэса Ала Клемянок.**

Нагадаем, што ўжо некалькі гадоў існуе Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Дзяржаўным пагранічным камітэтам Рэспублікі Беларусь і Грамадскім аб’яднаннем «Саюз пісьменнікаў Беларусі». У рамках гэтага супрацоўніцтва рэгулярна адбываюцца выступленні пісьменнікаў Гродзенскай вобласці перад ахоўнікамі дзяржаўнай мяжы, сумесныя творчыя мерапрыемствы.



Выступленне Алы Леанідаўны Клемянок адбылося ў вучэбным цэнтры Інстытута пагранічных войскаў. У праграме літаратурнага мерапрыемства гучалі вершы і песні паэтэсы ў аўтарскім выкананні. Акрамя гэтага наша калега прапанавала вайскоўцам віртуальны экскурс па гістарычных мясцінах Смаргонскага раёна. Апавядала пра гісторыю Крэўскага замка, пра слынных грамадскіх дзеячоў і творцаў, як князь Ягайла, палітык і кампазітар Міхал Клеафас Агінскі, паэт-дэмакрат і сялянскі адвакат Францішак Багушэвіч, а таксама згадвала сучасных пісьменнікаў Смаргонскага краю Мар’яна Дуксу, Алеся Жамойціна і іншых.

На сустрэчы з паэтэсай-краязнаўцай, аўтарам і выканаўцай песень прысутнічалі вайскоўцы тэрміновай службы пагранічных войскаў Рэспублікі Беларусь.

Выступленне было ўспрыняла аўдыторыяй з цікавасцю, вельмі цёпла і прыязна. Ала Леанідаўна атрымала запрашэнне выступіць тут яшчэ.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**Гродзенскае абласное аддзяленне**

**На фота:** член СПБ, паэтэса Ала Клемянок у гасцях у ваеннаслужачых тэрміновай службы пагранічных войскаў Рэспублікі Беларусь. Смаргонскі раён, Гродзенская вобласць. Люты 2024 года.


ПОГРАНИЧНИКИ ДОЛЖНЫ ЗАНИМАТЬСЯ
ЗЕМЛИ И С ГОРДОСТЬЮ ЗАЩИЩАТЬ


ПОГРАНИЧНИКИ ДОЛЖНЫ ЗАНИМАТЬСЯ СВОИМ ДЕЛОМ - ХОДИТЬ ПО ПОСЛЕДНИМ МЕТРАМ НАШЕЙ
ЗЕМЛИ И С ГОРДОСТЬЮ ЗАЩИЩАТЬ МИР И ПОКОЙ БЕЛОРУССКОГО НАРОДА.
А.Г. ЛУКАШЕНКО


ПОГРАНИЧНИКИ ДОЛЖНЫ ЗАНИМАТЬСЯ СВОИМ ДЕЛОМ - ХОДИТЬ ПО ПОСЛЕДНИМ МЕТРАМ НАШЕЙ
ЗЕМЛИ И С ГОРДОСТЬЮ ЗАЩИЩАТЬ МИР И ПОКОЙ БЕЛОРУССКОГО НАРОДА.
А.Г. ЛУКАШЕНКО


ПОГРАНИЧНИКИ ДОЛЖНЫ ЗАНИМАТЬСЯ СВОИМ ДЕЛОМ - ХОДИТЬ ПО ПОСЛЕДНИМ МЕТРАМ НАШЕЙ
ЗЕМЛИ И С ГОРДОСТЬЮ ЗАЩИЩАТЬ МИР И ПОКОЙ БЕЛОРУССКОГО НАРОДА.
А.Г. ЛУКАШЕНКО


РЭСПУБЛІКА
БЕЛАРУСЬ